

Ю.Ясінскайтэ. "Даўгая шыя".



І. Шчасная. "Цюльпан".

# Калі сааўтар — агонь

**Міжнародны пленэр па мастацкай кераміцы "Арт-жыжаль", якім славіцца Бабруйшчына, завяршыўся выстаўкай пад назвай "Агняпіс" у Нацыянальным мастацкім музеі. Сёлета ў пленэры ўдзельнічалі 24 майстры з Беларусі, Балгарыі, Літвы, Латвіі, Малдовы, Польшчы, Расіі, Румыніі ды Украіны.**



**А.Ткачоў. "Клоун".**

Пашанцавала тым, хто прыйшоў на вернісаж 21 жніўня, бо паглядзець на творы — гэта адно, зусім іншае — пазнаёміцца з удзельнікамі "Арт-жыжаля", пачуць пра вынікі пленэру ад яго нязменнага кіраўніка Валерыя Калтыгіна, пабачыць відэафільм, дзе прыгажуны ў чыстых апратках ператвараюцца ў апантаных майстравых, што працуюць на свежым паветры з прыроднымі матэрыяламі і днём і ноччу.

На выстаўленых жа работах мы бачым усе адценні колеру, незвычайныя пластычныя рашэнні, тэматычныя знаходкі, адрозненні беларускіх прац ад створанага замежнымі майстрамі. Вельмі прыемна, што зробленае нашымі керамістамі ў агульным кантэксце вылучаецца, і госці пленэру сапраўды могуць атрымаць майстар-клас, наведаўшы Бабруйск. Але і ў іх варта падкрэсліць свежасць і арыгінальнасць кампазіцый, нейкую ўнутраную разняволенасць. Згадайма высокую вертыкальную скульптуру "Няскошанае поле" малдаваніна Алега Дабравольскага і маленькія рэшатападобныя "Лугі" полькі Зоф'і Касёрэк: майстры смела і проста выявілі даволі абстрактныя тэмы, за якія беларусы нават не браліся ў сваім мастацкім пошуку.

Зрэшты, Алег Ткачоў, кераміст, які 6 гадоў запар удзельнічае ў пленэрах, адзначае, што менавіта ў яднанні з прыродай, у акружэнні калег, з адрэналінам і, як вынік, хуткай рэакцыяй з'яўляюцца самыя незвычайныя творы. "У мяне ў майстэрні стаіць такая ж печ, якая была там, але я ніколі не ствару падобных рэчаў у ёй, бо няма таго парыву. Бывае, што на пленэры загаруся нейкай ідэяй, а пасля працую над ёй увесь год. "Арт-жыжаль", да ўсяго, — выдатная школа для маладых керамістаў. Калі яны не прайшлі праз пленэр, то многага не бачылі". Прыкладам, цікава будзе пазнаёміцца на выстаўцы з творамі Паўла Пракапцова ды іншых маладых майстроў, што таксама пакаштавалі ў свой час жорсткага, ды смачнага "хлеба" керамістаў. Іх вырабы вельмі самабытныя, і паказваюць маладыя сябе ў калектыве, зазвычай, добра.

Пасля правядзення "Арт-жыжалю" (і сёлетні, шосты па ліку, не выключэнне) у Бабруйску абнаўляецца калекцыя твораў, цяпер іх каля двухсот. На выстаўцы ў Мінску можна пабачыць пяцьдзесят работ трыццаці аўтараў, якія ў розныя гады ўдзельнічалі ў пленэрах, дзе сааўтарам мастака выступае агонь.



**Л.Захарава. "Берагі".**

**Алена САБАЛЕЎСКАЯ**